УДК 395.5

# ФУНКЦЫЯНАВАННЕ ІНФАРМАЦЫЙНАЙ МАДЭЛІ СЯЛЯНСКАЙ ГРАМАДЫ Ў БЕЛАРУСКІМ ТРАДЫЦЫЙНЫМ ГРАМАДСТВЕ

Карбалевіч Н.М.
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт

Грамада, або сялянская вясковая абшчына, з’яўлялася асноўнай сацыякультурнай адзінкай і асноўнай формай грамадскага жыцця беларускага сялянства ў традыцыйнай культуры. Роля, статус, функцыі і вобраз грамады былі трывала замацаваныя ў свядомасці сялянаў праз сацыялізацыю. Так, у традыцыйнай светапогляднай сістэме была сфарміраваная своеасаблівая інфармацыйная мадэль грамады, якая транслявала ўсю каштоўнасную і функцыянальную інфармацыю, неабходную для пажаданай інтэграцыі сялянаў у традыцыйны грамадскі асяродак. Такая інфармацыйная мадэль уяўляла сабой сукупнасць інфармацыі, якая характарызавала формы ўзаемаадносінаў сялянаў у межах грамады, механізмы і формы грамадскай рэгуляцыі паводзінаў, базавыя аспекты сацыяльнай рэальнасці традыцыйнай беларускай вёскі.

На падставе фальклору, звычаёвага права і жыццёвых выпадкаў, замацаваных у калектыўнай памяці сялянаў, мадэляваліся рэакцыі грамады на тыя ці іншыя дзеянні яе члена, класіфікаваліся сацыяльныя сітуацыі, у якіх мог апынуцца селянін, замацоўваліся катэгорыі, якія ўплывалі на статус і рэпутацыю чалавека, акрэсліваліся функцыі і структурныя элементы грамады як сістэмы ўзаемаадносінаў і сацыяльнага інстытуту і інш.

Каштоўнасная афарбоўка калектыўнага ладу грамадскага жыцця адлюстравана ў фальклоры, занатаваным амаль па ўсіх рэгіёнах Беларусі. Напрыклад: “Грамада – вялікі чалавек” [1], “Хто жыве ў купі, у таго ні баліць ў пупі” [2] і інш. Можна лічыць, што ідэя калектыўнасці і ўзаемазалежнасці сялянскага ладу жыцця, з’яўлялася базавай для інфармацыйнай мадэлі грамады. Таксама ў пазначанай інфармацыйнай мадэлі, а значыць і ў народных уяўленнях, грамада, ці іншымі словамі супольнасць людзей, грамадскі асяродак, выступала як адзіны актыўны калектыўны суб’ект дзеяння, з якім лічыліся, да якога апелявалі ў спрэчных сітуацыях, якому нават спрабавалі супрацьстаяць у прыватных выпадках. Распаўсюджаныя аказіянальныя абрады таксама мяркуюць пад сабой вялікую ролю грамадскага калектыўнага дзеяння, за якім замацоўваўся статус сакральнасці.

Значнай структурнай часткай мадэлі з’яўляліся пажаданыя алгарытмы паводзінаў людзей у разнастайных сацыяльных сітуацыях. Гэтыя

алгарытмы знаходзіліся ў непасрэднай залежнасці ад полу, узросту, сямейнага становішча, шлюбнага статусу, гаспадарчай спецыялізацыі, рэпутацыі сялянаў і інш. Інфармацыйная мадэль апісвала разгалінаваную сістэму санкцый за невыкананне традыцыйных алгарытмаў паводзінаў, якія маляўніча, часта ў эмацыянальнай афарбоўцы, трансляваліся членам грамады. Грамада таксама выступала як калектыўны інстытут кантролю за выкананнем нормаў паводзінаў і адначасова інстытут экспертызы адпаведнасці рэальных паводзінаў сялянаў пажаданым сацыяльным нормам.

Традыцыйная сацыяльная культура беларускіх сялянаў прадугледжвала магчымасці рэгламентаваць і максімальна прадбачыць усе магчымыя выпадкі грамадскага жыцця, каб стабілізаваць існаванне сацыяльнага асяродку, стварыць камфортную, функцыянальную і прадказальную сістэму ўзаемаадносінаў. Інфармацыйная мадэль грамады дакладна не прадугледжвала спантаннасці і крэатыўнасці паводзінаў чалавека з традыцыйнага грамадства ў большасці сацыяльных сітуацый і прцэсаў.

Характэрныя грамадскія ўзаемадносіны мадэляваліся на прынцыпах адкрытасці, узаемнай зацікаўленасці і выгодзе членаў грамады, узгодненасці з традыцыяй, інтэнсіўнасці камунікацыі, існавання адзінай сістэмы перадачы інфармацыі, прыярытэтнасці калектыўных інтарэсаў і інш. Выразна выяўлялася каштоўнасць для сялянаў сваёй сацыяльнай сістэмы. Мясцовасць, тутэйшасць вызначалася як аксіялагічна афарбаваны паказальнік інфармацыйнай мадэлі. Гэта вынікала і з разумення каштоўнасці свайго асяродку з пункту гледжання знаёмасці, камфортнасці грамадскай сістэмы ўзаемаадносінаў. Міжвясковае супрацьстаянне адлюстроўвала ўспрыняцце чужога грамадскага асяродку як небяспечнага. Сацыяльная рэальнасць грамады ўяўляла сабой замкнёнтую прастору, за межамі якой існаваў чужы, невядомы свет. Характар узаемаадносінаў у грамадзе і ўвесь лад сялянскага жыцця дазваляе меркаваць, што грамада з’яўлялася культурнай адзінкай са складанай структурай і сукупнасцю разнастайных функцый, у межах якой супольная інфармацыйная мадэль адыгрывала вызначальную ролю.

Менавіта ад уключанасці ў адзіную інфармацыйную сістэму, ад успрыняцця базавай інфармацыйнай мадэлі ў традыцыйным беларускім грамадстве залежала якасць грамадскіх узаемаадносінаў чалавека, яго абароненасць грамадой ад знешняй небяспекі.

Інфармацыйныя мадэлі з’яўляюцца змястоўным кампанентам грамадскіх супольнасцяў напрацягу ўсёй гісторыі чалавецтва. Інфармацыйная мадэль грамады ў традыцыйнай беларускай вёсцы ўяўляе цікавасць засяроджаннем агромністага камунікатыўнага досведу. Яна з’яўлялася своеасаблівай сістэмай сацыяльных каардынат, у якой існаваў

чалавек, які з’яўляўся часткай сацыяльнага асяроддзя, і дэманструе светапогляднае вымярэнне селяніна як члена сацыяльнай супольнасці. Унармаваная інфармацыя замацоўвала культурны кантэкст грамадскіх узаемаадносінаў. Супольныя каштоўнасці, слоўныя формулы, пажаданыя і зразумелыя алгарытмы паводзінаў і інш. вызначалі прыналежнасць да гэтага культурнага кантэксту.

Такім чынам, сацыяльная рэальнасць грамады ў традыцыйнай беларускай вёсцы грунтавалася на эфектыўным функцыянаванні спецыфічнай інфармацыйнай мадэлі, якая апісвала ўсе сферы грамадскага жыцця беларускіх сялянаў і транслявалася ў працэсе сацыялізацыі, вызначаючы прыналежнасць селяніна да грамадскага асяродку, а значыць задавала тон усяго жыцця чалавека.

## Літаратура

1. Пяткевіч, Ч.Г. Рэчыцкае Палессе / Ч.Г. Пяткевіч; уклад.; прадм. У. Васілевіча; пер. з пол. Л. Салавей і У. Васілевіча. – Мінск: “Беларускі кнігазбор”, 2004. – С. 597.

2. Federowski, M. Lud białoruski na Rusi Litewskiej: materiały do etnografii słowiańskiej zgromadzone w latach 1877–1905: w 8 t. / M. Federowski. – Kraków,Warszawa, 1902 – 1981. – T. 4: Przysłowia, żarciki, wyrażenia stałe oraz zagadki ludu, mieszczan i zagrodowców z okolic Grodna, Sokółki, Białegostoku, Bielska, Wołkowyska, Słonima, Nowogródka, Słucka, Lidy, Wilejki, Swięcian i Oszmiany. – Warszawa: Towarzystwo Naukowe Warszawskie, 1935. –S. 157.

УДК 9(476)

# СПОРТИВНАЯ ЗИМА БПИ, ЯНВАРЬ 1965 Г. (ПО МАТЕРИАЛАМ ГАЗЕТЫ «СОВЕТСКИЙ ИНЖЕНЕР»)

Киселева С.А., Давидович А.В.
Белорусский национальный технический университет

БНТУ исполнилось 100 лет! Это серьезный возраст и очень красивый юбилей! В БПИ – БНТУ училось и работало огромное количество студентов и преподавателей.  В связи с этим праздником этого праздника хочется заглянуть в прошлое БПИ и узнать, как жил наш Белорусский политехнический институт в шестидесятые годы 20-го века.